

Чаго чакаць ад «Белай вежы»?

СТАР. 3



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Пад аховай святога Елісея

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ВЕРАСНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 173 (27783) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ДЗЕЛЯ РОСКВІТУ АЙЧЫНЫ

### Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў высокія дзяржузнагароды заслужаным работнікам розных сфер

Прэзідэнт асабліва адзначыў заслугі беларускіх вучоных, падзякаваўшы ім за няспынны інтэлектуальны пошук і ўменне знаходзіць рашэнні самых складаных практычных задач. У прыватнасці, высокіх дзяржаўных узнагарод удастоены прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кіраўнікі яе структурных падраздзяленняў і інстытутаў за развіццё перспектыўных інавацыйных напрамкаў, такіх як нанаматэрыялы, біятэхналогіі, новыя методыкі ў медыцынскай сферы. Не засталіся без увагі і вышэйшыя навучальныя ўстановы, размешчаныя ў рэгіёнах краіны, у якіх разам з навучаннем студэнтаў актыўна вядзецца навукова-даследчая работа. «Поспехі беларускай навукі прызнаны далёка за межамі нашай краіны. Але галоўнае: вынікі адкрыццяў вучоных знаходзяць прымяненне ў самых розных галінах айчыннай народнай гаспадаркі і прыносяць рэальную карысць Беларусі», — падкрэсліў Прэзідэнт.



Фота БЕЛТА.

**Прэзідэнт уручае ўзнагароду кіраўніку БЕЛТА Дзмітрыю ЖУКУ.**

Кіраўнік дзяржавы таксама ўручыў дзяржузнагароды службовым асобам, якія ўдзельнічалі ў арганізацыі і правядзенні аднаго з найбольш значных мерапрыемстваў бягучага года — чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску. Прэзідэнт падкрэсліў, што арганізацыя спаборніцтва такога маштабу, якое наша дзяржава праводзіла ўпершыню, запатрабавала зладжанай работы вельмі многіх людзей, занятых у самых розных прафесійных сферах. Беларусь змагла годна сустрэць удзельнікаў чэмпіянату і шматлікіх балельшчыкаў, забяспечыць іх бяспеку, камфорт і вольны час.

У ліку ўзнагароджаных на ўрачыстай цырымоніі прысутнічалі і лепшыя прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў і Генеральнай пракуратуры. У іх актыве прадухіленне правапарушэнняў, забеспячэнне асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян, а таксама эканамічнай бяспекі Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў уклад работнікаў БЕЛТА ў развіццё сферы інфармацыйна-камунікацыйных паслуг, удасканаленне тэхнічнай базы, пашырэнне партнёрскіх сувязяў з інфармагенцтвамі СНД і далёкага замежжа.

Сярод узнагароджаных таксама дзеячы культуры. «Дзякуй вам за служэнне мастацтву, за тое, што дорыце нам радасць і прыгажосць, даносіце да сваіх чытачоў і гледачоў духоўныя каштоўнасці», — сказаў Прэзідэнт у іх адрас.

Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў ордэнам Айчыны III ступені старшыню Мінскага гарвыканкама Мікалая Ладуцьку. Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені ўзнагароджаны начальнік галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама генерал-маёр міліцыі Аляксандр Барсукоў, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта генерал-маёр Ігар Буткевіч, начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях палкоўнік унутранай службы Уладзімір Рафальскі. Ордэнам Пашаны адзначаны заслугі старшыні асацыяцыі «Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь» Яўгена Ворсіна.

Прэзідэнт узнагародзіў ордэнам Айчыны III ступені Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ва Украіне Валянціна Вялічку.

Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені ўзнагароджаны першы намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі генерал-маёр міліцыі Валянцін Міхневіч і начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама генерал-маёр міліцыі Ігар Яўсееў.

Ордэнам Пашаны адзначаны заслугі прафесара кафедры Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны Сямёна Абрамава, дырэктара Інстытута фізіка-арганічнай хіміі НАН Беларусі Аляксандра Більдзюкевіча, гендырэктара Беларускага тэлеграфнага агенцтва Дзмітрыя Жука. Гэтай жа ўзнагароды ўдастоены начальнік цэнтра сувязі і аўтаматызаваных сістэм Беларускага тэлеграфнага агенцтва Самуіл Рыжэвіч, дырэктар прадпрыемства «Дызайн-студыя СЭНС» Уладзімір Трафіменка і першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей Чыжык.

Ганаровае званне «Народны артыст Беларусі» прысвоена артыстцы-вакалістцы Гомельскай абласной філармоніі Галіне Паўлянок.

## КАЛІ ДРЭВЫ БЫЛІ САДЖАНЦАМІ



Фота БЕЛТА.

*Лесагадавальнік у Петрыкаўскім лясгасе быў створаны ўсяго два гады таму, але яго зялёныя прыгожыя «выхаванцы» вядомыя ўжо нават за межамі краіны. На плошчы 5,7 га тут вырошчваюць 52 віды саджанцаў, сярод якіх і дуб звычайны, і клён, і сасна, і каштан, і ліпа, і туя, і нават экзатычны кіпарысавік, улік якога вядуць студэнтка 5-га курса Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, будучы спецыяліст лясной гаспадаркі Алена ДЗЯХЦЯР і лесавод гадавальніка Алена БАМБІЗА.*

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ШЫЦЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па бюджэце і фінансах:**

***«У Беларусі плануецца прадаваць жыллё ў лізінг — такая норма прадугледжана ў праекце закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь». Норма, якая змяшчаецца ў гэтым праекце закона, дазволіць даць грамадзянам краіны магчымасць выкарыстоўваць механізм лізінгу для набыцця маёмасці — напрыклад, жылля, аўтамабіляў, бытавой тэхнікі і гэтак далей. Раней такая паслуга была даступная толькі фізічным асобам, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць. Гэтая магчымасць дазволіць многім вырашыць сваё кватэрнае пытанне. Таксама ўкараненне лізінгу для фізічных асоб знізіць нагрузку на банкаўскую сістэму па крэдытаванні эканомікі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.09.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10490,00 | ▲ |
| Еўра | 13550,00 | ■ |
| Рас. руб. | 280,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 809,93 | ▼ |

■ Рыхтуецца закон

## ЖЫЦЦЁВА ВАЖНАЯ АДМОВА

### Рэвалюцыйныя антынаркатычныя захады могуць быць прыняты да канца года



**Праект закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абарачэння наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў» быў унесены Саветам Міністраў у парламент 1 ліпеня 2013 года (спачатку дакумент меў іншую назву). Законапраект знаходзіцца ў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы, аднак вясной гэтага года да работы над ім актыўна далучыўся намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ. Дарэчы, нядаўна менавіта ён дакладваў кіраўніку нашай дзяржавы пра тое, як ідзе падрыхтоўка дакумента. «Я жыву праектам гэтага закона», — патлумачыў «Звяздзе» парламентарый і алімпійскі прызёр. Гэта і стала нагодай для сустрэчы і інтэрв'ю нашай газеце.**

СТАР. 2

■ Свята над Прыпяццю

## УБАЧЫЦЬ ЦУДЫ ПАЛЕССЯ

### Заўтра аграгарадок Ляскавічы Петрыкаўскага раёна трэці раз будзе сустракаць фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся»

А вось у фармаце міжнароднага свята — упершыню. Такім чынам выконваецца адзін з пунктаў Дзяржаўнай праграмы па развіцці Прыпяцкага Палесся на 2010-2015 гады. Арганізатары грандыёзнага свята ставяць перад сабой мэту не толькі здзівіць усіх этнічнай самабытнасцю і ўнікальнасцю рэгіёна, але і прыцягнуць у гэты куточак Палесся інвестараў і турыстаў. **Генеральны дырэктар нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан БАМБІЗА** лічыць, што патэнцыял гэтых мясцін вялікі, вельмі цікавы і невычарпальны. Прыпяцкае Палессе мае сэнс наведваць не толькі падчас свята, калі сюды з'едзецца шмат народу, але і тады, калі ўзнікае жаданне застацца адзін на адзін з унікальнай прыродай і адпачыць душой.

СТАР. 2



■ Надвор'е

## Цёпла і без дажджоў

**У выхадныя будзе на 3-5 градусаў цяплей за кліматычную норму, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У суботу і нядзелю будзе сонечна. Уначы — плюс 7-14 градусаў, удзень — 19-24 цяпла, а па поўдні тэмпература паветра стане дасягаць нават плюс 26 градусаў.

У першай палове наступнага тыдня чакаецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е, але стане на некалькі градусаў халадней. Раніцай у нізінах магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы знізіцца да плюс 4-10 градусаў, на поўдні — да 12 цяпла. Удзень чакаюцца камфортныя 17-22 цяпла, а па поўдні Беларусі тэмпература паветра будзе дасягаць плюс 24 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕС дапусціў магчымасць перагляду санкцый супраць Расіі

Санкцыі Еўрасаюза супраць Расіі, якія павінны ўступіць у сілу 12 верасня, могуць быць перагледжаны або адменены. Пра гэта агенцтву ІТАР-ТАСС паведаміла дыпламатычная крыніца ў Бруселі. «Рашэнне гатова. Новыя санкцыі ўступяць у сілу 12 верасня пасля апублікавання ў афіцыйным часопісе ЕС», — заявіла крыніца. Паводле яе інфармацыі, увядзенне санкцый прадэманструе адзінства ЕС. У той жа час у залежнасці ад сітуацыі ва Украіне яны могуць быць перагледжаны або адменены. Як паведамляла раней амерыканская газета The Wall Street Journal, пад санкцыі могуць трапіць расійскія дзяржаўныя нафтавыя кампаніі «Газпрам нафта», «Транснафта» і «Раснафта».

### Казахстанскіх паліцэйскіх пакінуць без жэзлаў

Казахстанскія паліцэйскія, пачынаючы з 2017 года, не будуць карыстацца жэзламі ў сваёй працы. У лістападзе мінулага года дарожная паліцыя ў Казахстане была скасавана. Былыя інспектары Упраўлення дарожнай паліцыі ўвайшлі ў склад падраздзяленняў адміністрацыйнай паліцыі. Тады ж кіраўніцтва МУС заявіла, што надалей будзе забараняць паліцэйскім спыняць аўтамабілі з дапамогай жазла. Калі выявіцца парушэнне, універсальныя паліцэйскія могуць спыняць толькі метадам патрулявання. Пры гэтым паліцэйскія павінны ўключыць маячкі і даць каманду спыніцца. Стаяць на дарозе з жазлом катэгарычна забаронена.

### Мёд больш эфектыўны, чым антыбіётыкі?



Шведскія навукоўцы разабраліся, чым менавіта мёд карысны для здароўя і якія рэчывы забяспечваюць яго бактэрыцыдныя ўласцівасці. Гэта ўнікальная група з 13 малочнакіслых бактэрый, якія трапляюць у мёд з мядовага валля пчол. У лабараторных умовах гэтыя бактэрыі былі выпрабаваны на некалькіх небяспечных патагенных арганізмах, сярод якіх метыцылінарэзістэнтны залацісты стафілакок, сінегнойная палачка і ванкаміцінарэзістэнтны энтаракок. Усе гэтыя мікробы былі знішчаны дзякуючы актыўным злучэнням, якія выдзяляюцца малочнакіслымі бактэрыямі. Потым навукоўцы змазалі свежым мёдам незагойныя раны некалькіх коней. У выніку ўсе язвы вылечыліся. На думку даследчыкаў, сакрэт эфектыўнасці мёду — у шырокім дыяпазоне дзейных рэчываў. 13 малочнакіслых бактэрый здольныя падбіраць патрэбны «кактэйль» у залежнасці ад пагрозы. Аднак у мёдзе, які прадаецца ў крамах, жывых бактэрый няма, што вельмі моцна аслабляе яго антымікробныя ўласцівасці.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### 53% шатландцаў выступілі супраць аддзялення ад Вялікабрытаніі

Прэса працягвае публікаваць супярэчлівыя звесткі апытанняў жыхароў Шатландыі з нагоды лёсу іх краіны — апошняе даследаванне сведчыць аб тым, што за аддзяленне ад Вялікабрытаніі на рэферэндуме 18 верасня гатовыя галасаваць менш людзей, чым за захаванне краіны ў складзе Злучанага Каралеўства. Паводле апытання, праведзенага агенцтвам Survation з вечара мінулай пятніцы да раніцы аўторка, 53% рэспандэнтаў збіраюцца прагаласаваць за захаванне цяперашняга статусу Шатландыі, 47% плануюць падтрымаць ідэю незалежнасці краіны. Раней паведамлялася, што апытанне, праведзенае 7 верасня службай YouGov, высветліла, што больш за 51% шатландцаў выступаюць за аддзяленне краіны ад Вялікабрытаніі. Новае апытанне паказвае, што вынік рэферэндуму па-ранейшаму невядомы, і ўсё можа змяніцца ў апошні момант.




КОРАТКА

Першы адкрыты чэмпіянат Беларусі па паветраплаванні пройдзе ў мінскім парку адпачынку «Сонечная даліна» з 12 па 14 верасня.

**Колькасць сумесных беларуска-амерыканскіх кампаній за два гады павялічылася на 35,5 працэнта.**

Больш як 3 тыс. прыбыўшых з Украіны звярнуліся па падтрымку ў Беларускі Чырвоны Крыж. На аказанне дапамогі зрасходавана звыш Br200 млн.

**Беларускі стралок Юрый Шчарбацэвіч заваяваў бронзу чэмпіянату свету па кулявой стральбе на дыстанцыі 50 м лежачы і ліцэнзію на Алімпіяду-2016. У камандным заліку ў гэтай намінацыі зборная Беларусі заняла другое месца, уступіўшы першынство кітайскім спартсменам.**

Жыхар Баранавічаў, які заснуў паміж рэйкамі, застаўся жывы пасля траўміравання грузавым цягніком. З дыягназам «ампутацыя правай ступні і вострае алкагольнае ап'яненне» ён быў дастаўлены ў Баранавіцкую гарадскую бальніцу.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## СВАЯ ПАЗІЦЫЯ І АЎТАРСКІ ПОГЛЯД



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

**Сяргей САЗАНЧУК, старшыня СВК «Ласіцк» Пінскага раёна:**

«Звязду» чытаю шмат гадоў. І не толькі таму, што гэта наша беларуская газета. Ужо даўно прывык да інтэлігентнага стылю выдання, да яе стрыманасці і разам з тым глыбіні ў справе падачы матэрыялаў. Неяк зазірнуў да суседа — кіраўніка СВК «Плешчыцы», і яму прынеслі на стол свежы нумар газеты. Аказваецца, і ён даўно выпісвае. Дык вось калега выказаў цікавую думку: здавалася б, усе газеты асвятляюць адны і тыя ж падзеі, прыводзяць адны і тыя ж факты. Але ў «Звяздзе» гэта часта падаецца скрозь прызму аўтарскай пазіцыі. Таму ў газеце бывае тое, што ў іншых выданнях не прачытаеш. І сапраўды, я заўважыў, што ў кожным нумары шукаю знаёмых аўтараў, над матэрыяламі якіх можна паразважаць. Іншая справа, згаджацца ці не згаджацца з іх пазіцыяй.

Чытаю, вядома, падборкі па эканоміцы, матэрыялы пра перадавыя гаспадаркі краіны, цікава бывае паглядзець на вопыт іншых, супаставіць думкі мэтраў-аграрыяў са сваімі. Але найбольш падабаюцца матэрыялы пра людзей, якімі багатая наша глыбінка. Добра, што «Звязда» не забываецца пра звычайных працаўнікоў-вяскоўцаў, якія сваімі рукамі ствараюць свой дабрабыт. Такіх у нас, у самай глыбіні Палесся, на мяжы з Украінай, таксама вельмі многа.

А газеце зычу сустрэць 100-гадовы юбілей і паспяхова перайсці ў новае стагоддзе.

**Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Пачалася падпіска на газету «Звязда» на IV квартал. Заставайцеся з намі — мы пішам пра тое, што сапраўды важна!*

■ Фестывалі

# ДА РОДНЫХ НІЎ, ДА РОДНАЙ ХАТЫ...

## Нашы суайчыннікі за мяжой не губляюць сувязі з радзімай

**Каб дапамагчы ім у гэтым, праводзіцца фестываль мастацтваў беларусаў свету. З 12 па 14 верасня для іх будуць днямі і настальгіі (для тых, хто з'ехаў і цяпер бярэ ўдзел у фестывалі ў якасці госця), і адкрыцця (для некаторых беларусаў, якія нарадзіліся за межамі, але спазнаюць цяпер радзіму бацькоў), і знаёмстваў — нас з імі, тымі, хто лічыць сябе часткай нашага народа і нясе яго культуру ў свет (у тых краінах, дзе жыве).**

Фестываль, які адбываецца другі раз (папярэдні прайшоў тры гады таму), паказвае вялікую цікавасць нашых суайчыннікаў да сваёй радзімы. Сёлета да нас прыязджаюць каля 250 удзельнікаў з 18 краін свету. Для параўнання: мінулы фэст сабраў удзельнікаў з 12 краін. Але мастацкія калектывы, асобныя людзі, якія праяўляюць сябе творча ў розных сферах, змагаліся за права прыехаць у Беларусь.

— Мы ўжо некалькі гадоў пад патранатам Міністэрства культуры праводзім конкурс на лепшую папулярызацыю беларускай культуры ў краінах пражывання беларускай дыяспары. Нашы суайчыннікі дасылаюць матэрыялы, дзе распавядаюць, што і як у іх праводзіцца. Заявак было шмат. Для кожнай краіны была пэўная квота, ансамблі праходзілі праз сур'ёзны адбор, каб трапіць у Беларусь на фестываль, — патлумачыў **Міхаіл РЫБАКОЎ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур.**

— Адначасова гэта папулярызацыя дасягненняў беларусаў замежжа і паказ свайго культурнага і турыстычнага патэнцыялу. Нашым гасцям будуць паказаны самыя знакавыя аб'екты культуры, — адзначыла **Наталля ЗАДЗЯРКОЎСКАЯ, начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Беларусі**.

Такім чынам, у нас (беларусаў з Беларусі) ёсць магчымасць паглядзець на іх, беларусаў, якія памятаюць пра тое, хто яны, і захоўваюць у сваіх сем'ях традыцыі тых вёсак, мястэчак і гарадоў, адкуль паходзяць. Яны там (!) імкнуцца не забываць мову, спяваюць свае песні, танчаць, гатуюць беларускія стравы. Яны могуць мець розныя прафесіі, а творчасць у родным рэчышчы — як аддушына, магчымасць разнявольвання і праява жадання ўсё ж такі быць сабой. Да нас прыедуць удзельнікі фальклорных калектываў, мастакі, народныя майстры, музыканты — нават з прафесійнай адукацыяй, якія дабіліся пэўных дасягненняў за мяжой. І кожны з іх — сведка таго, наколькі моцная родная культура ў чалавеку.

Яны пакажуць сваё майстэрства падчас сустрэч, выстаў, канцэртаў. 12 верасня з творчасцю беларусаў замежжа пазнаёмяцца жыхары аграгарадкоў і гарадоў Міншчыны. У суботу госці зробяць свой падарунак Мінску з нагоды свята горада.

— Беларусы замежжа ў сэрцы лічаць Мінск сваёй сталіцай нягледзячы на тое, што жывуць не тут, — адзначыў Міхаіл Рыбакоў. — Нават у тых краінах, дзе беларусы пражываюць, паводле водгукаў мясцовых жыхароў і ўлад, яны заўсёды запрашаюць на мерапрыемствы і ўражваюць прыгажосцю. Беларуская культура прыгожая, гарманічная, і людзі, якія яе нясуць, запатрабаваныя і заўважаныя там, дзе яны жывуць.

Каб і нам гэта ўсё заўважыць і адчуць гарманічнасць, якая тут, на месцы, магчыма, здаецца звыклай, трэба наведаць выставы і канцэрты. Лепшыя калектывы і выканаўцы, якія найбольш спадабаюцца, 14 верасня прымуць удзел у выніковым гала-канцэрце ў Белдзяржфілармоніі, які пачнецца а 15-й гадзіне. Цікава, што самай маленькай удзельніцы, спявачцы з Мексікі Вользе Сотнікавай-Рамас, усяго 7 гадоў. І яна прыехала сюды як беларуска. Ёй і яе бацькам трэба гэта. Трэба гэта далёкая радзіма, загадкавая (на адлегласці), адметная (для кагосьці, можа быць, нават экзатычная), з асаблівай цеплынёй (не ў клімаце справа!) Беларусь...

**Ларыса ЦІМОШЫК** ■

# УБАЧЫЦЬ ЦУДЫ ПАЛЕССЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

— У 90-я гады мінулага стагоддзя Палессе ператварылася ў закінуты край. Вось тады Прэзідэнт краіны наведаў гэтыя мясціны і пабачыў на свае вочы іх патэнцыял. Паступова ў краіне стаў наводзіцца парадак, пачалі адраджацца прамысловыя цэнтры, а потым і Палессе. Цяпер тут эфектыўна працуюць па ўсіх напрамках: і лясная гаспадарка ў нас магутная, і дрэваапрацоўка. Вялізныя зрухі адбыліся ў сельскай гаспадарцы — пабудаваны суперсучасныя фермы з прымяненнем робатаў. Развіваем і мясную жывёлагадоўлю. Уся вытворчасць актыўна развіваецца, што ўрэшце садзейнічае дабрабыту людзей.

**Калісьці адсюль прадавалі лес для будаўніцтва караблёў англійскага флоту. Уся Еўропа і Расія выкарыстоўвалі наш дуб для развіцця чыгуначнага транспарту.**

***— Якім чынам сёння выкарыстоўваецца пойма Прыпяці? Ці застаюцца яшчэ рэсурсы?***

— Пойма — гэта прыродны комплекс, створаны рукамі чалавека. Гістарычна па Прыпяці заўсёды былі дубровы. У розны час яны эксплуатаваліся вельмі актыўна. Напрыклад, калісьці адсюль прадавалі лес для будаўніцтва караблёў англійскага флоту. Уся Еўропа і Расія выкарыстоўвалі наш дуб для развіцця чыгуначнага транспарту. Дубовыя шпалы таксама выкарыстоўваліся для трамвайных пуцей. Маластвядомы факт: з палескага дуба ў гады першых савецкіх пяцігодак выраблялася аснашчэнне для Магнітагорскага металургічнага камбіната і Горкаўскага аўтамабільнага завода. Каб тут не было да вайны і пасля яе леспрамгасаў — людзі з голаду паўміралі б. А так — працавалі і заўсёды былі з куском хлеба. Тысячы гадоў асвойвалася пойма ракі Прыпяць. Чалавек яе выкошваў, паляпшаліся ўмовы для размнажэння рыбы. Цяпер тут ідэальнае месца для яе нерасту. З нізоўя Дняпра велізарныя касякі рыбы падымаюцца ў пойму Прыпяці. Гэты комплекс сёння пастаянна падтрымліваецца ў належным стане. Мы завялі кароў асаблівай пароды, якія даюць так званае «мармуровае» мяса і адначасова «апрацоўваюць» пойму Прыпяці. Вядома, што ў прыродзе існуе сімбіёз. Балотныя птушкі — бакас, дупель — не будуць жыць на пойме, калі там не будзе жывёлы. Калісьці кіраўнік каралеўскага таварыства аховы птушак Англіі мне расказваў, што ў адным з іх нацыянальных паркаў налічваецца 17 тысяч галоў жывёлы. У нас менш, але каб захаваць пойму, каб яна не зарастала, мы той жа справай займаемся. Да таго ж пойма — гэта вельмі прыгожыя краявіды, і наша задача — захаваць, зберагчы яе.

***— Была гаворка аб працягу будаўніцтва турыстычных комплексаў у Ляскавічах і наваколлі. Што атрымалася ўвасобіць у жыццё?***

— У выхадныя дні трапіць да нас, у парк «Прыпяцкі», — цэлая праблема. Месцы браніруюцца за 2-3 месяцы наперад. Турыстычная гаспадарка — гэта цэлы комплекс паслуг. І першае — годныя ўмовы пражывання. Цікава, што ўсе хочуць быць як мага бліжэй да прыроды, да нацыянальнага каларыту, і пры гэтым жадаюць карыстацца ўсімі дабротамі цывілізацыі. Наша нацыянальная кухня традыцыйна папулярная, нашы дранікі ўсе хочуць паспытаць. Ёсць і комплекс дадатковых паслуг. Людзям важна ўтульна пасядзець-пагаварыць дзесьці... І ўсё ж галоўнае, з-за чаго сюды едуць — пабачыць некранутасць прыроды. Нам тут ёсць што паказаць. Прыпяць фарміруе ўнікальны комплекс. Гэта не толькі рака і пойма, але і лясы, і славутыя балоты. Ёсць чым здзіўляць і ёсць куды развівацца. У нас добры гатэль «Над Прыпяццю». Сёлета адкрылі яшчэ адзін — «Тураў» у горадзе Тураве. Ёсць вельмі шмат паляўнічых дамкоў — і таннейшыя і даражэйшыя — на любы густ. Вельмі важна, каб людзі багацелі, тады сфера турыстычнага адпачынку будзе запатрабавана. У гэтым сэнсе беларусам скардзіцца грэх: у нас стабільныя праца і зарплата.

***— Фестываль «Покліч Палесся» змяніў фармат — стаў міжнародным. Якімі разынкамі будзеце здзіўляць?***

— Сёлета да нас прыязджае вялікая колькасць замежных гасцей: калектывы з Расіі, Украіны, Сербіі, Польшчы, Малдовы... Чакаем нават прадстаўнікоў Кітая. З кожным годам фестываль «Покліч Палесся» абрастае новымі мерапрыемствамі. Сёлета ў яго межах гледачы змогуць наведаць канцэрт заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Ірыны Дарафеевай, стаць удзельнікамі творчай сустрэчы са стваральнікамі фільма «Белыя росы. Вяртанне», а таксама свята ручніка. Упершыню госці ўбачаць выступленні аўтэнтычных калектываў «Палескія гульні». Праграма ўключае разнажанравыя ўзоры фальклору з фрагментамі старадаўніх летніх і восеньскіх каляндарна-земляробчых і сямейна-бытавых свят і абрадаў, а таксама правядзенне традыцыйных народных гульняў. Будзе арганізавана фотавыстава «Славутыя палешукі», якая раскажа пра вядомых людзей — выхадцаў з беларускага Палесся. Некаторым з іх у гэты дзень будзе прысвоена званне «Ганаровы паляшук». Таксама адбудзецца цырымонія гашэння спецыяльнага паштовага штэмпеля. Плануецца правядзенне конкурсаў «Прыгажуня Палесся» і маладой сям'і... Сам фестываль — гэта цуд. Усё, што робіцца на кожным падворку, на кожным конкурсе — гэта цуд, звязаны з народам і яго традыцыямі. Гэта такая радасць для простых людзей!

***— Як будуць дабірацца да Ляскавіч палешукі з навакольных раёнаў? Ці хопіць месца ў гатэлях і аграсядзібах для наведвальнікаў і ўдзельнікаў?***

— Ад Брэста да Гомеля ўсе былі ўцягнуты ў падрыхтоўку свята. На мінулы фестываль прыехала 10 тысяч чалавек, сёлета будзе, напэўна, яшчэ больш. Папярэднія мерапрыемствы нас многаму навучылі, і цяпер мы «дашліфавалі» ўсе дробязі. Узгаднілі маршруты дастаўкі людзей, іх пражыванне і харчаванне. Задзейнічана ўся інфраструктура — ад Мазыра да Пінска. Я атрымліваю асалоду, калі бачу твары нашых людзей, што прыязджаюць сюды і прымаюць удзел ва ўсіх мерапрыемствах. Ад гэтай радасці атрымліваеш такую энергію, што хочацца рабіць больш і больш. Думаю, што фестываль будзе расці і развівацца. Галоўнае, што ёсць кірунак і разуменне, што гэта ўсё сёння патрэбна ў першую чаргу звычайным людзям — усім палешукам.

**Вельмі важна, каб людзі багацелі, тады сфера турыстычнага адпачынку будзе запатрабавана. У гэтым сэнсе беларусам скардзіцца грэх: у нас стабільныя праца і зарплата.**

***— Такія народныя святы, як «Покліч Палесся», робяцца сіламі вялізнага калектыву...***

— Гэты праект нам дапамагаў увасобіць у жыццё сёлета цэлы шэраг прадпрыемстваў Беларусі. Асноўнымі арганізатарамі фестывалю выступаюць Брэсцкі і Гомельскі аблвыканкамы, шэраг міністэрстваў: культуры, інфармацыі, сельскай гаспадаркі і харчавання, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а таксама Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод і Белаграпрамбанк. Дзякуй ім за дапамогу!

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ЖЫЦЦЁВА ВАЖНАЯ АДМОВА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Вадзім Анатольевіч, чаму вы асабіста ўключыліся ў падрыхтоўку антынаркатычнага законапраекта?***

— Я паверыў у шчырасць яго распрацоўшчыкаў. Калі пазнаёміўся бліжэй з работай упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў, у прыватнасці, з яго начальнікам Мікалаем Карпянковым, то пераканаўся, што там працуюць прафесіяналы, якія перажываюць за кожную чалавечую душу, якую патэнцыяльна могуць загубіць гандляры наркотыкамі. Супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў сапраўды робяць усё магчымае, каб з усіх бакоў засцерагчы, у першую чаргу, нашу моладзь, ад гэтай смяротнай атруты. Я зразумеў, што ў гэтай каманды ёсць сіла, і далучыўся да яе.

***— Як даўно гэта адбылося?***

— Падчас удзелу ў ток-шоу «Форум» на тэлеканале «Беларусь 1» у сакавіку гэтага года. Менавіта тады я прыняў рашэнне далучыцца да каманды, якая змагаецца з наркотыкамі, і агучыў гэта на ўсю краіну. І хоць законапраект знаходзіцца ў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы, назваць Пастаянную камісію па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы, у якой я працую, абстрагавана ад гэтай праблемы нельга.

Дапаможа зразумець мяне такая аналогія. Я — кідальнік молата. Калі б да мяне падышоў трэнер або спартыўны функцыянер і спытаў: «Што вам трэба, каб кінуць молат яшчэ далей?», я, магчыма, адказаў бы: «Нічога не трэба, у мяне ўсё ёсць», але быў рады такой шчырай гатоўнасці дапамагчы. Вось і я спытаў супрацоўнікаў упраўлення па наркакантролі: «Якія яшчэ патрэбны захады на заканадаўчым узроўні, каб дапамагчы вам больш эфектыўна змагацца з распаўсюджваннем наркотыкаў?»

У адказ да мяне паступіла змястоўнае пісьмо, з якога было відаць, што мне паверылі, і з гэтага моманту я разам з Пастаяннай камісіяй па нацыянальнай бяспецы працую над гэтым законапраектам.

***— Што ўдалося зрабіць за гэты час?***

— Мы напоўнілі законапраект рэвалюцыйнымі нормамі, якія патрэбны не толькі сёння, але вызначаюць дзень заўтрашні.

Любы законапраект рыхтаваць вельмі складана: вывяраецца кожная літара, кожная коска, зацікаўленыя бакі могуць месяцамі спрачацца і тым самым прасоўванне дакумента вельмі затрымліваць. У гэтым выпадку была рызыка зацягнуць прыняцце законапраекта на няпэўны перыяд, але мы ўзяліся і разам зрабілі такі дакумент, які дазволіць рэальна супрацьдзейнічаць наркатычнай атацы на нашу краіну, знешняй і ўнутранай.

Некаторыя нормы, якія прапануюцца, выклікаюць дыскусіі. Напрыклад, увядзенне адміністрацыйнай адказнасці за знаходжанне ў стане, выкліканым ужываннем наркатычных, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў. Лічу, што чалавек, які знаходзіцца ў такім стане, трымаў у руках наркотык, а гэта ўжо — крымінальнае злачынства, якое называецца «незаконнае захоўванне». Крымінальная адказнасць за незаконнае захоўванне наступае незалежна ад таго, як доўга рэчыва знаходзілася ва ўладанні вінаватага. Ужыць наркотык, не трымаючы яго ў руках, не захоўваючы яго пры сабе хаця б некалькі секундаў, немагчыма. Дык чаму мы павінны закрываць вочы на таго, хто ўжыў, калі ведаем, што ён да гэтага наркотык захоўваў? Яму ўдалося пазбегнуць крымінальнай адказнасці за здзейсненае злачынства, але ж цяпер мы прапануем пакараць яго хаця б штрафам.

Безумоўна, усе тэхнічныя моманты трэба адпрацаваць, нельга дапусціць, каб нормы закона трактаваліся дваяка, калі можа пацярпець невінаваты. Мы павінны спяшацца, але не на шкоду якасці. Думаю, усе пытанні, якія ўзнікаюць у працэсе работы над законапраектам, справядлівыя, але вырашаць іх трэба хутчэй.

Я за адназначнасць і юрыдычную граматнасць, бо сам заканчваў юрыдычны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, але лічу, што заўвагі, якія не носяць канцэптуальнага характару, можна дапрацаваць да другога чытання. Першае чытанне — гэта абмеркаванне канцэпцыі, генеральнай лініі, саміх заканадаўчых мер.

Напрыклад, трэба, каб незаконны выраб альбо перапрацоўка наркатычных сродкаў ва ўмовах лабараторыі караліся пазбаўленнем волі? Трэба штрафаваць чалавека, які знаходзіцца пад уздзеяннем наркатычных сродкаў? Трэба ўзмацніць пакаранне за збыт наркотыкаў у школах, бальніцах, вайсковых часцях, у начных клубах або непаўналетнім? Тады давайце прымем законапраект у першым чытанні. Мы тым самым прадэманструем свой намер.

***— Якая была ацэнка кіраўніка нашай дзяржавы даклада пра работу над законапраектам?***

— Я пачуў поўную падтрымку ў тым, што нельга губляць час. Упэўніўся, што Прэзідэнт лічыць вырашэнне праблем з нарказалежнасцю ў Беларусі надзвычай важнай справай. Думаю, што кіраўнік дзяржавы не дазволіць далей разгойдвацца. Мы правялі вялізную работу і маем выдатную фактуру. Спадзяюся, што ў восеньскую сесію мы правядзём дакумент у двух чытаннях.

***— Яшчэ адно важнае новаўвядзенне, якое прапануе праект закона, — стварэнне міжведамаснай антынаркатычнай камісіі. Што яна павінна сабой уяўляць?***

— Яна павінна стаць самым сур'ёзным інструментам для прафілактыкі распаўсюджвання наркотыкаў. Дзейнасць гэтай камісіі не дасць магчымасць зарабляць людзям, якія стварылі новую хімічную формулу наркотыку, пакуль не ўнесеную ў Рэспубліканскі пералік забароненых наркатычных і псіхатропных сродкаў. Як толькі знойдзена новае наркатычнае рэчыва, антынаркатычная камісія, у якой будуць прадстаўлены Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, МУС і Міністэрства аховы здароўя, на ўзроўні міністраў прымае рашэнне, інфармацыя пра гэта з'яўляецца на сайце, і на наступны дзень гэтае рэчыва аказваецца па-за законам.

***— Ці ёсць падобныя камісіі ў іншых краінах?***

— Я пра гэта не ведаю. У мяне склалася ўражанне, што Беларусь на сёння сярод еўрапейскіх краін з'яўляецца лідарам у барацьбе з наркотыкамі. Ва ўсякім разе — у разуменні цяжару наступстваў.

***— Галандцы, як вядома, увогуле ўзаконілі, з пэўнымі абмежаваннямі, гандаль наркатычнымі рэчывамі ў спецыялізаваных кавярнях.***

— Я веру спецыялістам, якія кажуць, што няма «лёгкіх наркотыкаў», што гэта — прыдумка маркетолагаў, мэта якіх уцягнуць чалавека ў залежнасць і прымусіць аддаваць грошы.

Мы ідзём па іншым шляху. Наша антынаркатычнае заканадаўства робіцца больш жорсткім. Наркадылерам у Беларусі нясоладка жывецца. Па выніках 6 месяцаў гэтага года, затрымана 2025 нарказлачынцаў, канфіскавана 55 кг псіхаактыўных рэчываў, 44 тоны насення маку і больш за 600 кг насваю. Толькі за два летнія месяцы знішчана больш за 123 тоны раслін маку і канопляў. Перакрыты 23 каналы пастаўкі ў краіну наркотыкаў і псіхатропаў, спыненая дзейнасць 12 падпольных наркалабараторый і ліквідавана 9 памяшканняў, прыстасаваных для вырошчвання раслін, якія змяшчаюць наркотыкі.

Усё гэта стрымлівае наркапагрозу, але без прафілактыкі, без растлумачальнай работы ў школах, дома, у сродках масавай інфармацыі не абысціся. Мы павінны казаць пра наступствы і ствараць альтэрнатыву дзіцяці ў выглядзе спартыўных клубаў і гурткоў. І тут наша дзяржава таксама робіць шмат.

**Мы правялі вялізную работу і маем выдатную фактуру. Спадзяюся, што ў восеньскую сесію мы правядзём дакумент у двух чытаннях.**

***— Падчас работы над законапраектам вы знаёміліся з канкрэтнымі трагічнымі выпадкамі, звязанымі з ужываннем наркотыкаў?***

— Усе гэтыя выпадкі вядомыя грамадскасці, бо цяпер органы ўнутраных спраў дзеляцца інфармацыяй са СМІ, каб грамадства асэнсавала рэальную пагрозу, якую нясе наркаманія, і сфарміравала негатыўнае да яе стаўленне.

Ёсць відэа лета 2013 года. Станцыя метро «Няміга», кампанія маладых людзей здымае на тэлефон свайго прыяцеля, які пад уздзеяннем спайсу паводзіць сябе неадэкватна. Потым ён кідаецца з верхняй пляцоўкі на платформу. Хлопец атрымаў траўму пазваночніка і застаўся інвалідам на ўсё жыццё.

Восенню таго ж года дзве сям'і ў Фрунзенскім раёне Мінска сабраліся адзначыць нейкую падзею, мужчыны пакурылі на балконе спайс, а потым адзін з іх апрытомеў і ўбачыў вакол сябе тры трупы, а сам аказаўся цяжка параненым. Пад уздзеяннем наркотыку ён зарэзаў трох чалавек, успароў сабе жывот і нічога пры гэтым не памятаў.

У лютым гэтага года 19-гадовы хлопец у Мінскім раёне пасля курэння спайсу разбіў рукамі шклопакет і памёр ад нанесеных сабе парэзаў. У сакавіку ў Мінску на вуліцы Прытыцкага двое мужчын 33 і 34 гадоў, якія за некалькі дзён да таго вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, увялі псіхатропнае рэчыва ўнутрывенна. Пасля гэтага ім стала здавацца, што яны робаты. Адзін з іх зарэзаў другога, каб знайсці ў ім «чып». Потым з той жа мэтай успароў жывот сабе.

У тым жа месяцы 24-гадовы кіроўца BMW пасля курэння спайсу за гадзіну здзейсніў больш за 10 аварый, пасля чаго ўскрыў сабе вены. А ў мікрараёне «Серабранка» 18-гадовы студэнт каледжа выкінуўся з акна разам з 15-гадовай дзяўчынай пасля ўжывання «марак». Хлопец загінуў. За першыя чатыры месяцы гэтага года ў Беларусі памерла 8 чалавек з-за перадазіроўкі наркотыкаў.

У чэрвені каля Лепеля «Аўдзі» ўрэзалася ў фуру, загінулі ўсе, хто быў у легкавой машыне. І пасажыры, і кіроўца знаходзіліся пад уздзеяннем наркотыкаў. У ліпені ў Гомелі трое маладых людзей пакурылі спайс, пасля чаго выразалі аднаму з кампаніі вочы, адрэзалі нос і вушы.

У той жа самы дзень у Жабінцы двое мужчын 42 і 46 гадоў купілі спайс, ад'ехалі ў лес на машыне, пакурылі і памерлі: адзін на ўздыху, другі — на выдыху. У жніўні ў лесе за Мінскай кальцавой дарогай знайшлі целы трох маладых мужчын, якія загінулі з-за перадазіроўкі метадону.

Нарэшце, 9 верасня ў Гродне 19-гадовы кіроўца SEAT, верагодна пад уздзеяннем спайса, збіў на аўтобусным прыпынку дзвюх жанчын, адна загінула...

***— Парламент працуе над законапраектам, міліцыя арыштоўвае зладзеяў, настаўнікі і бацькі засцерагаюць... Што залежыць ад саміх падлеткаў і маладых людзей?***

— Паспрабаваць або не. Прамаўчаць або не.

***— Але моладзь не прымае даносчыкаў.***

— Можна супрацьстаяць наркотыкам не даносячы. Калі чалавек дасягае пункта невяртання, то пра тое, што ён наркаман, вядома ўсім. Аднак калі ўзнікае намер паспытаць, кожны можа адмовіцца сам і паўплываць на выбар іншага. У такіх выпадках неабходна выказаць катэгарычнае непрыняцце, бо размова ідзе пра жыццё і смерць. Нельга саўдзельнічаць у забойстве. У любой кампаніі можна сказаць: «Я ў гэтым не ўдзельнічаю і вам не раю» і пайсці, каб не падвяргаць небяспецы сябе і іншых. Пацярпець можа не толькі той, хто ўжывае наркотык, але і той, хто аказваецца побач.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Запрашаем!

# СВЯТА ЎЛЮБЁНЫХ У ПРЫРОДУ

**Заўтра ў Мазыры распачнуцца фінальныя мерапрыемствы XII рэспубліканскага экалагічнага форуму — знакавай падзеі для ўсіх, хто імкнецца зберагчы чысціню, хараство і разнастайнасць беларускай прыроды. Сёлета галоўнае «зялёнае» свята краіны прымеркавана да Года гасціннасці.**

Удзельнікі форуму змогуць сустрэцца з аднадумцамі, падзяліцца вопытам у вырашэнні экалагічных праблем, а таксама прэзентаваць свае распрацоўкі на спецыялізаванай выставе «Сучасныя тэхналогіі ў вобласці рацыянальнага прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя». Падчас форуму будуць падведзены вынікі рэспубліканскіх конкурсаў экалагічнай накіраванасці.

Удзельнікам форуму накіраваў прывітанне прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч. У сваім звароце ён адзначыў: «Падобныя мерапрыемствы спрыяюць беражліваму стаўленню да прыроды, да той спадчыны, якую мы павінны перадаць нашым дзецям і ўнукам; разуменню таго, што ў нашых руках не толькі наш лёс, але і лёсы ўсяго жывога на планеце. У свеце няма нічога больш узаемазвязанага, чым навакольнае асяроддзе і здароўе чалавека. Мы не можам абыходзіцца без вады, паветра, адмовіцца ад іншых выгод, якія нам дае прырода. Таму захаванне навакольнага свету, такога далікатнага і ўразлівага, з'яўляецца адной з галоўных задач».

**Вераніка КОЛАСАВА** ■


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению Минского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:**

**ЛОТ № 1: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА № 63**, об. пл. 97,7 кв.м, инвентарный номер 600/С-136917, 1961 г.п., расположенное по адресу: **Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Горанский с/с, д. Великое Село. Начальная цена с НДС – 233 400 000 бел. руб.** Земельный участок для обслуживания здания магазина пл. **0,0768 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 06.12.2041 с ограничением (водоохранная зона).
**ЛОТ № 2: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА**, об. пл. 91,7 кв.м, инвентарный номер 600/С-138765, 1989 г.п., расположенное по адресу: **Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, д. Казеково, ул. Центральная 28А. Начальная цена с НДС – 268 100 000 бел. руб.** Земельный участок для обслуживания здания магазина пл. **0,0762 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 05.08.2042.
**ЛОТ № 3: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА**, об. пл. 80 кв.м, инвентарный номер 600/С-135066, 1993 г.п., расположенное по адресу: **Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Папернянский с/с, д. Рахманьки**. **Начальная цена с НДС – 151 700 000 бел. руб.** Земельный участок для обслуживания здания магазина пл. **0,0340 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 24.07.2041, с ограничениями (водоохранная зона реки Вяча; зона санитарной охраны водозабора «Новинки» г. Минска).

Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».
*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 19.08.2014 г.*
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Аукцион состоится **25.09.2014** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.09.2014 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.**


■ Загад выкананы!

# «СУШКІ» І «МІГІ» НА ТРАСЕ



Знішчальнікі прызямляюцца на аўтамагістраль — гэта хутчэй падобна на галівудскі баевік. Але гэта не так. Падобнае майстэрства падуладнае не толькі героям фільмаў, а і беларускім лётчыкам. На трасе Мінск — Магілёў 10 верасня прайшлі вучэнні па выкарыстанні аўтамабільных участкаў дарогі ў якасці запаснога аэрадрома. Дарэчы, падобныя манеўры беларускія вайскоўцы адпрацоўваюць не першы раз. Яшчэ з 2007 года ў ВПС і войсках ППА Беларусі стала распрацоўвацца пытанне выкарыстання аўтамабільных дарог для пасадкі самалётаў.

З самай раніцы быў перакрыты ўчастак трасы Мінск — Магілёў. Салдаты па некалькі разоў роўным строем праходзяць па «пасадачнай паласе» — прыбіраюць любую дробязь, якая можа пашкодзіць самалёт пры пасадцы. Даўжыня паласы каля трох кіламетраў, шырыня — дваццаць метраў. Падчас вучэнняў пасадку і ўзлёт з АУД (аэрадромны ўчастак дарогі) адпрацоўвалі два «Су-25» і два «МіГ-29». Авіяцыйнае прыкрыццё раёна палётаў вялі верталёты «Мі-24 181», якія таксама прызямляліся на трасу.

Чым жа адрозніваецца звычайная аўтамагістраль ад той, на якую можна саджаць самалёты? На гэтае пытанне адказаў **Сяргей КАВАЛЕВІЧ, намеснік начальніка — начальнік інжынерна-аэрадромнай службы ВПС і войскаў ППА, упраўлення тылу ВПС і войскаў СПА:** «Аэрадромны ўчастак дарогі адрозніваецца ад простага тым, што ён прамалінейны, працягласць павінна быць не менш за 2100 метраў, а шырыня не менш за 16, таўшчыня пакрыцця і пакрыцця пад асновай большая, чым на звычайным участку».

Колькі такіх трас на тэрыторыі Беларусі, ніхто так і не прызнаўся — ваенная тайна.

**Сяргей НІКАНОВІЧ, фота аўтара** ■




## Предложение о покупке акций собственного выпуска

| | |
|---|---|
| **Покупатель акций** | **Открытое акционерное общество «Постторг»**, юридический и почтовый адрес: 220070, г. Минск, улица Клумова, 3; 8 (017) 230-31-01, 8 (029) 667-46-43. |
| **Эмитент и его местонахождение** | **Открытое акционерное общество «Постторг»**, юридический и почтовый адрес: 220070, г. Минск, улица Клумова, 3; 8 (017) 230-31-01, 8 (029) 667-46-43. |
| **Цель приобретения акций** | Уменьшение уставного фонда и аннулирование акций. |
| **Количество акций, которое намеревается приобрести покупатель** | 15000 (пятнадцать тысяч) простых (обыкновенных) акций собственного выпуска. |
| **Цена покупки** | 70 000 (семьдесят тысяч) белорусских рублей за одну акцию. |
| **Срок, форма и порядок оплаты акций** | Денежными средствами по безналичному или наличному расчету по договоренности сторон в течение 5 рабочих дней после регистрации договора. |
| **Адрес представления предложений на продажу акций** | г. Минск, ул. Клумова, 3, кабинет 45, в рабочие дни с 9.00 до 13.00; 14.00 до 17.00. |
| **Адрес заключения договоров купли-продажи** | ОАО «Постторг» г. Минск, ул. Клумова, 3, каб. 45. |
| **Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций** | с 15 сентября 2014 года по 15 октября 2014 года включительно. Датой представления предложений считать дату регистрации предложения Обществом. |
| **Дата начала и окончания покупки акций** | с 20 октября 2014 года по 22 января 2015 года включительно. |

УНП 100036531

# ДЗЯЎЧЫНА З ІТАЛЬЯНСКІМ ТЭМПЕРАМЕНТАМ

TV@R

## ВЯДУЧАЯ ВОЛЬГА РЫЖЫКАВА ЛІЧЫЦЬ, ШТО Ў КАДРЫ І ЗА КАДРАМ ГАЛОЎНАЕ — ЗАСТАВАЦЦА ЧАЛАВЕКАМ

**Яна вось ужо амаль тры гады дзеліцца добрым настроем з гледачамі «Добрай раніцы, Беларусь» на тэлеканале «Беларусь 1». Не першы год вітае прыхільнікаў і гасцей фестывалю «Славянскі базар» на канцэртнай сцэне. Піша песні і спявае сама ў гурце Da Vinci. А некалькі месяцаў таму адкрыла ўласную справу. І, як яна сама заўважае, працяг абавязкова будзе!..**



Фота Іны АЛЬШЭЎСКАЙ.

***— Вольга, якімі падзеямі парадавала лета ў гэтым годзе?***

— Думаю, сёлета яно было ў мяне знакавым. Самая яркая падзея ў маёй асабістай біяграфіі — адкрыццё кавярні ў сценах Белтэлерадыёкампаніі. Я рыхтавалася да гэтага паўгода і так супала, што менавіта летам мы з камандай аказаліся гатовымі, каб прымаць людзей. Безумоўна, яскравай падзеяй застаецца «Славянскі базар». Гэтым разам мне даверылі весці канцэрт адкрыцця фестывалю… Яшчэ, як ні дзіўна, я шмат ездзіла па свеце, але ніколі не была ў Іспаніі. І вось нарэшце туды паехала. Перад паездкай крыху засмуцілася, бо гэтае лета там палічылі самым халодным за апошнія 30 гадоў, але, як высветлілася, не знайсці лепшага надвор'я для славянскага чалавека. Сонца свеціць, 30 градусаў, прачынаешся ўвесь час у добрым настроі — і цябе чакае мора. Выходзь і з асалодай бяры ад жыцця ўсё…

**Канцэрт доўжыцца і тры, і чатыры гадзіны, а трэба не губляць градусу настрою і разумець: ты як гаспадар у доме, які, прымаючы гасцей, дакладна ведае, каму зрабіць чай, а каго можна ўжо спаць пакласці.**

***— Як вам у ролі бізнесвумен?***

— Яна для мяне абсалютна новая. Усім займаюся самастойна, але ёсць добрая каманда, дзе і бармен, і кухар, і адміністратар — словам, поўны штат людзей, каб наша ўстанова жыла. Лічу, кожны павінен займацца сваёй справай, аднак у многія нюансы справы за гэты час ужо ўнікла. Зразумела, не магу, напрыклад, адсочваць усе змены ў заканадаўстве ў гэтай сферы, таму не абысціся без дапамогі юрыста. Са свайго боку, як чалавек, які шмат вандраваў, я дакладна разумею, чаго патрабаваць ад сваёй каманды, і маю ўяўленне, што спадабаецца нашым наведвальнікам. Не ўсё можна зрабіць адразу, і мы дапрацоўваем нейкія моманты.

***— Вандруючы па свеце, як ставіцеся да кухні той ці іншай мясцовасці?***

— Дзе б я ні была, не раблю з ежы культу, а ўспрымаю яе проста як сродак для падтрымання жыццядзейнасці арганізму. Знаходзячыся недзе за мяжой, зразумела адну рэч: хочаш паесці сытна — выбірай італьянскую альбо нямецкую кухню. Кажуць, для чалавека наогул найбольш карысныя тыя прадукты, якія растуць альбо вырабляюцца ў мясцовасці, дзе ён нарадзіўся. Таму ў вандроўках, напрыклад, па Азіі альбо Афрыцы іншы раз, магчыма, не варта эксперыментаваць са стравамі, каб не сапсаваць падарожжа дрэнным самаадчуваннем.

***— Тое, што ваш дзень пачынаецца з ранішніх эфіраў, неяк уплывае на яго працяг?***

— Мой працоўны дзень пачынаецца а пятай раніцы, а ў дзевяць гадзін, калі многія толькі ідуць на працу, я ўжо вяртаюся адтуль. Часам знаёмыя цікавяцца, ці адаптавалася я да такога графіку? Да такога нельга прывыкнуць, хоць і працую на праграме я ўжо амаль тры гады. Але я люблю сваю працу, мне падабаюцца прамыя эфіры. Экран — як лакмусавая паперка, дзе адразу відаць, які ты. Тут самае галоўнае, ці зможаш ты застацца перад вокам камеры самім сабой… Калі выходжу з офіса, то нейкі час яшчэ адчуваю бадзёрасць, а потым стараюся планаваць свой дзень так, каб была магчымасць некалькі гадзін паспаць. А там гадзін з дзвюх — новы рывок. Адчуванне, быццам за адзін дзень пражываеш два.

***— Працяглы час у эфіры «Добрай раніцы» вы былі з Дзянісам Дудзінскім, а з нядаўніх пор побач з вамі ў кадры Глеб Давыдаў…***

— З Глебам, як мне здаецца, мы вельмі пасябравалі. У нас няма момантаў, дзе мы б не разумелі адно аднаго. Наколькі мы гарманічна глядзімся ў кадры, лепш відаць збоку. У эфіры ён, як сапраўдны мужчына, сочыць не толькі за сабой, але ў любы момант можа выратаваць свайго партнёра. А за кадрам і каву зварыць, і заўсёды пацікавіцца, як жыццё.

***— Што патрэбна вядучаму, каб не адчуваць дыскамфорту? У прыватнасці, на сцэне?***

— Калі ў ранішнім эфіры вядучы — гэта хутчэй мадэратар, то канцэрты — зусім іншая гісторыя. На тым жа «Славянскім базары», дзе гук мікрафона разлятаецца па ўсім амфітэатры, трэба працаваць інакш. Аднак галоўнае для вядучага, незалежна ад месца працы, каб ён любіў сваю справу, жыў ёю. Бывае, канцэрт доўжыцца і тры, і чатыры гадзіны, а трэба не губляць градусу настрою і разумець: ты як гаспадар у доме, які, прымаючы гасцей, дакладна ведае, каму зрабіць чай, а каго можна ўжо спаць пакласці. Вядучы задае настрой усяму мерапрыемству, таму для поспеху патрэбен не толькі прыгожы касцюм, макіяж і ўменне правільна назваць прозвішчы артыстаў. Важна ўмець падрыхтаваць гледача да сустрэчы з артыстам, згладзіць нейкі недахоп арганізатараў альбо тэхнічную перашкоду — вось дзе праяўляецца майстэрства! Роля пастаноўшчыка, рэжысёра заканчваецца з пачаткам канцэрта. Далей сцэнарый у тваіх руках: як ты яго данясеш, такой і будзе святочная атмасфера.

***— Наколькі важная роля музыкі ў вашым жыцці?***

— Як мінімум яна — гэта адна з магчымасцяў зарабляць. Ігры на фартапіяна я прысвяціла 13 гадоў жыцця. Цяпер ужо не іграю на ім, але інструмент пераязджае са мной з месца на месца. І тут, як з людзьмі, нельга проста закрэсліць перыяд свайго жыцця і зрабіць выгляд, што яго не было. Я амаль штодня сутыкаюся з музыкай: калі пішу песні, на канцэртах… Бывае, нават гляджу рэкламу і вызначаю, якая там мелодыя выкарыстана. Таму музыка — такі багаж, які я маю і нясу з сабой па жыцці. Аднойчы здарылася са мной вось якая гісторыя. На «Славянскім базары» ўжо пасля конкурсу мы апынуліся на закрытым прыёме з членамі журы. Тады старшынёй там быў Дунаеўскі. Ён пайшоў на балкон пакурыць, а я села за раяль і пачала іграць. А калі Максім Ісаакавіч непрыкметна вярнуўся і паслухаў мяне, то мы пачалі музіцыраваць у чатыры рукі. Гэта быў адзін з тых выпадкаў, калі я падумала: варта было столькі вучыцца, каб сыграць з ім.

***— Вы ўдзельніца гурта Da Vinci, які спявае на італьянскай мове. Музыка якіх італьянскіх выканаўцаў вам падабаецца?***

— Адрыяна Чэлентана для мяне, мабыць, лідар. У яго адчуваецца свабода ва ўсім: у голасе, у манеры апранацца, у паводзінах. Мне здаецца, што б ён ні зрабіў — гэта будзе глядзецца, бо ў яго свой адметны стыль. На сучаснай італьянскай эстрадзе, на жаль, не заўважаю яркіх выканаўцаў. Нават у «Еўрабачанні» краіна не ўдзельнічала некалькі гадоў. Італія закрытая і самадастатковая, але там умеюць цаніць сваіх і даказваць, што яны лепшыя.

***— Вам як жанчыне ўласціва нешта італьянскае?***

— Магчыма, падабенства прысутнічае ў тэмпераменце, таму што я таксама люблю жэсты, бываю вельмі эмацыянальнай і імпульсіўнай, калі распавядаю пра нешта. А пра знешнасць магу сказаць, што яна ў мяне ўніверсальная, і нават у замежных краінах (у Еўропе альбо на Усходзе) мяне часта прымаюць за мясцовую.

***— Цяга да авантурызму пры выбары спосабу адпачынку паранейшаму ўласціва вам?***

— Па скалах лазіць перастала пасля ўзыходжання ў Крыме, зразумела — гэта не маё. У рэальных умовах аказалася не гатовай, каб маё жыццё «вісела на вяроўцы». Пад ваду апускалася неаднаразова — люблю дайвінг. Часам задумваюся пра тое, што ў жыцці нас падсцерагае шмат нечаканасцяў, і, можа, праз гэта ў мяне спрацоўвае інстынкт самазахавання. Цяпер жыву іншымі інтарэсамі: вучуся танцаваць лаціну, хацела б працягваць развіваць бізнес, рэалізоўваць сябе ў напісанні песень. Такія рэчы вельмі захапляюць, узнікае жаданне спрабаваць увесь час нешта новае.

***— Ці верыце вы ў лёс?***

— Веру, а цяпер асабліва, бо гэты год быў дастаткова складаным у многіх момантах. У жыцці, калі нешта страчваецца ў адным месцы, дадаецца ў іншым. Сёння я адчуваю сябе абсалютна шчаслівай, таму што ёсць праца, якая мне падабаецца, магчымасць рэалізоўваць свае ідэі, нягледзячы ні на што. Побач ёсць людзі, якія заўсёды падтрымаюць. Думаю, усё гэта падарункі лёсу. Мы іх атрымліваем часцей за ўсё ў тыя моманты, калі не чакаем. І ўсё наладжваецца.

**Алена ДРАПКО.**

■ Трэба бачыць!

# «БОЧКА СМЕХУ» І СУМНЫ ШЭКСПІР




## Сёлетні фестываль «Белая вежа» ў Брэсце адкрыецца карнавалам

**Восень для Брэста — гэта пара тэатралаў. 12 верасня 19-ы раз узніме заслону міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа». У апошнія гады з'явілася традыцыя — прысвячаць фэст якой-небудзь тэме. Гэтым разам, паводле задумкі аўтараў, тэатральны форум павінен быў стаць прысвячэннем Шэкспіру. Не склалася. З-за грошай. Як усё ў свеце ўзаемазвязана: фінансавы крызіс, плацежаздольнасць грамадзян, галін мастацтва, дзяржаў, і ў выніку — немагчымасць таго ці іншага тэатра дазволіць сабе лішні выезд на гастролі. (Вось вам і тэма для новай тэатральнай пастаноўкі…)**

### Адгалоскі крызісу

Аляксандр Казак, нязменны арганізатар фестывалю, дырэктар Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, мысліць катэгорыямі канкрэтнымі. Калі кошт спектакля дасягае 50 тысяч еўра і больш, запрасіць яго да ўдзелу ў нашым фестывалі складана. Таму ад некаторых шэкспіраўскіх спектакляў з вялікім шкадаваннем давялося адмовіцца.

І не толькі ад шэкспіраўскіх. Заявак, як заўсёды, было нашмат больш, чым змяшчае сёлетняя праграма фестывалю. Але тэатрам усё цяжэй выязджаць. А гаспадары фэсту таксама павінны часткова пакрываць расходы гасцей: на дарогу, пражыванне і сам спектакль. І сёння нават некаторыя беларускія тэатры не могуць прыехаць за свой кошт у Брэст — прымаючы бок мусіць плаціць і за іх. Застаецца толькі зайздросціць самім сабе, успамінаючы, як дзясятак гадоў таму аб гэтых пытаннях амаль не думалі, а на брэсцкую сцэну выходзілі праслаўленыя ў свеце калектывы.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Але ж і сённяшні фестываль нельга назваць «бедным сваяком» папярэднікаў. На «Белай вежы» гэтым разам чакаюць 24 творчыя калектывы з 13 краін свету. Варта заначыць, што ў афішы фэсту ўсё ж аказаліся тры пастаноўкі па матывах Вільяма Шэкспіра. Гэта «Бегчы з Эльсінора, або Гамлет навыварат» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, «Кароль Джон» Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Габрыэла Сундукяна з Арменіі і «Зімовая казка» Дзяржаўнага прафесійнага тэатра юнага гледача імя Надара Думбадзэ з Грузіі.

### Спектакль Някрошуса — падзея «Вежы»

Цікава, але амаль за два дзясяцігоддзі фестывальнай гісторыі ў нас не было тэатра з Казахстана. Цяпер будзе. Тэатр з Алматы вязе ў Брэст гістарычную драму «Султан Бейбарс». І, несумненна, падзеяй гэтага фэсту становіцца прыезд тэатра Meno Fortas з Вільнюса, якім кіруе вядомы рэжысёр Эймунтас Някрошус.

Аказалася, што гэты калектыў спрабавалі запрасіць на «Вежу» ўжо некалькі гадоў запар. Ды паездкі вільнюскіх калег распісаны на некалькі гадоў наперад. І вось нарэшце брастаўчанам удалося ўклініцца ў напружаны графік сусветна вядомага тэатра і яго рэжысёра. Тым больш прыемна, што вільнюсцы вязуць да нас прэм'еру. Спектакль «Кніга Іова» — тэатральная падзея мінулага сезона. Ён быў паказаны ўпершыню ў найстарэйшым крытым тэатры Еўропы «Алімпіка», які знаходзіцца ў італьянскім горадзе Вічэнца. Потым пастаноўка прайшла некалькі разоў у Літве і болей нідзе. І арганізатары брэсцкага фэсту ганарацца, што ў гэтым сэнсе апярэдзілі нават Маскву. Заслужана ганарацца.

### «Сны Кабзара» і іншыя вулічныя дзеі

Адной з фішак «Белай вежы» даўно сталі вулічныя спектаклі. Калі нехта не можа дазволіць сабе набыць білет на фестывальны спектакль, то дакрануцца да высокага мастацтва можна і бясплатна, на вуліцы. Тым больш што на галоўнай плошчы горада не раз выступалі вядомыя тэатры. Вось і сёлета на плошчу Леніна выйдзе, можна сказаць, даўні сябар фестывалю — Львоўскі акадэмічны тэатр «Уваскрэсенне». За пастаноўку «Вішнёвы сад» у 2007 годзе ён, дарэчы, узяў Гран-пры «Белай вежы». На другі дзень фэсту тэатр з Львова пакажа спектакль «Сны Кабзара», прысвечаны Тарасу Шаўчэнку. А ў нядзелю брастаўчане ўбачаць яшчэ адзін вулічны спектакль — «Бочка смеху» «Тэатра на Чамаданах» з польскага горада Вроцлаў. Гэта дзіцячы вулічны спектакль, ён, трэба думаць, прыйдзецца даспадобы юным гледачам.

І зноў даводзіцца згадаць пра крызіс, гары ён гарам. Бо менавіта ён перашкодзіў запрасіць на фестываль знакаміты вулічны спектакль «Планета Лем». Усё было добра, але заяўлены кошт пастаноўкі — 30 тысяч еўра — прыглушыў імпэт арганізатараў. «Для вулічнай дзеі, на якую не прадасі білетаў, гэта занадта вялікая сума»,— канстатаваў Аляксандр Казак.

### Замест журы — рада фестывалю

Затое старт сёлетняму святу Мельпамены дае вясёлы карнавал. Тэатралізаванае шэсце пачнецца з плошчы Леніна і працягнецца да тэатра. А падорыць гэтае рознакаляровае відовішча гледачам калектыў з Эстоніі «Giraffe Royal», які ў дзень адкрыцця выступіць са спектаклем у грамадска-культурным цэнтры. Гонар жа адкрыць фестываль 12 верасня выпаў на гэты раз айчыннаму калектыву — Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Горкага дасць «Хітрыкі Ханумы».

Прысуджаць узнагароды «Белай вежы» вырашылі па леташнім узоры. Лёс Гран-пры вырашае не журы, а рада фестывалю, куды ўваходзяць члены аргкамітэта, тэатральныя крытыкі, журналісты. Рада выбірае і пераможцаў у намінацыях, напрыклад, за лепшую мужчынскую альбо жаночую ролю. А вось наступны, юбілейны фэст пакуль мяркуецца зрабіць наогул без узнагарод. Вядуцца перамовы з лепшымі тэатрамі, якія ў розныя гады прыязджалі на фестываль. Сярод іх, ёсць спадзяванне, будуць і пераможцы мінулых гадоў. Таму няма сэнсу наладжваць паміж імі спаборніцтва. Гэта будзе проста свята тэатральнага мастацтва.

Але да яго яшчэ год. Сёлета ж спаўняецца 70 гадоў Брэсцкаму акадэмічнаму тэатру драмы. І гэтая падзея будзе адзначана прэм'ерай спектакля «Гульня любові і выпадку». Дарэчы, названай пастаноўкай сем дзесяцігоддзяў таму і пачаўся тэатр у Брэсце. Ёсць нагода ўзгадаць мінулае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 15 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05 Меладрама «Аляксандра».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.15, 15.25 Меладрама «Князёўна з хрушчоўкі».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.20** Нашы.
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.30** Дзень спорту.
**0.45 Дэтэктыў «Алібі — надзея, алібі — каханне».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.05, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.40 Серыял «Сашка».**
**10.40 Фільм-казка «Фініст — Ясны Сокал».**
**12.00 Камедыя «Прыходзьце заўтра».**
**13.50 Дэтэктыў «Марыя Верн: Мёртвыя маўчаць».**
**15.35** «Comedy Батл. Без межаў».
**17.50, 0.00 Серыял «Трыццацігадовыя».**
**18.50 Серыял «Універ».**
**19.50 Серыял «Фізрук». 1-я і 2-я серыі.**
**20.55** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**21.35 Серыял «Віртуозы».**
**22.50 Дэтэктыў «Кулінар».**
**23.55** Хачу ў тэлевізар!

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 14.25, 18.40, 23.40** «Калейдаскоп».
**8.10, 14.40, 18.55** «Галасы з мінулага». 85 гадоў з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Арлена Кашкурэвіча.
**8.20, 22.05** «Дыя@блог P.S.».
**8.50 Сусветнае кіно. «Сталёвыя магноліі».**
**10.50 «Бронзавая птушка». Маст. фільм. 1-я—3-я серыі.**
**14.00** «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Бронзавая птушка».
**14.45 «Два байцы». Маст. фільм.**
**16.00** «Камертон». Паэт, празаік, кінасцэнарыст, рэжысёр, акцёр, грамадскі дзеяч Яўген Еўтушэнка.
**16.30 Серыял «Праклятыя ўтульны дом». Заключная серыя.**
**17.20 «Карусель». Маст. фільм.**
**19.05 «Дачнікі». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**21.10** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**22.30** «Размаўляем па-беларуску».
**23.00** «Подых струн».

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**10.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. КПР — «Манчэстэр Юнайтэд».
**12.00** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — ЦСКА.
**13.55** Баскетбол. Кубак С.Л. Халіпскага. Жанчыны. Беларусь — Кітай.
**15.40** Пляжны футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2015.
**16.55** Баскетбол. Кубак С.Л. Халіпскага. Жанчыны. Кітай — Турцыя.
**18.55** Баскетбол. Кубак С.Л. Халіпскага. Жанчыны. Беларусь — Іспанія.
**20.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Халл Сіці» — «Вест Хэм».
**23.55** Час футбола.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Шлюб па завяшчанні. Танцы на вуголлі».
**13.10** М/ф.
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Добры дзень».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Барселона-92. Апошняе золата».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Добрыя рукі».**
**22.05** «Легенды Live. «Nirvana».
**22.50** «Вячэрні Ургант».
**23.30 Трылер «Канстанцін».**
**1.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Мінчшына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Чыстая работа».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** Канцэрт дзіцячай творчасці «Ці то яшчэ будзе...».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Дзіўная справа».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Баявік «Танга і Кэш».**
**22.15** «Глядзець усім!».
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**7.45, 23.40** «Беларусь сёння».
**8.10 Маст. фільм «Сентыментальнае падарожжа на бульбу».**
**9.30 Маст. фільм «Жоўты карлік».**
**11.10** Дак. серыял «У свеце ежы».
**12.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.15 Серыял «Агульная тэрапія 2».**
**14.05, 0.05** Дак. серыял «Тайныя знакі».
**15.15** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.05 Серыял «Чэмпіён».**
**18.15, 2.45 Серыял «Скліфасоўскі».**
**21.00 Маст. фільм «Артэфакт».**
**22.40** «Навіны культуры».
**23.30** Навіны. Галоўная тэма.

*1.00 — Прафілактыка.*

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.55 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Танкі. Уральскі характар». Фільм 1-ы.
**16.40** «Касманаўтыка».
**17.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**19.20** «Навука 2.0».
**20.50 Серыял «Даведайся пра мяне, калі зможаш».**
**23.40** «Вечнае жыццё. Медыцына будучыні».
**0.30 Серыял «Жанчыны на грані».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ ранішай».
**8.05** «Да суда».
**9.05, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.30, 17.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.20** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.30** «Пракурорская праверка».
**15.30** «Ядзім дома».
**16.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**20.05 Серыял «Брат за брата».**
**22.00** Анатомія дня.
**22.55 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.45 Серыял «Глухар. Вяртанне».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.30, 19.00, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30** «Сёння клюе».
**8.00 Меладрама «Шаснаццацігадовая маці».**
**9.30, 17.55 Серыял «Каралева Поўдня».**
**10.20** «Кінаблакнот».
**10.40 Камедыя «Дзённікі нянькі».**
**12.35** Дак. серыял «Кошак на любіць нельга».
**13.25 Серыял «Кузей Гюней».**
**15.20, 18.45** «Тэлемагазін».
**16.30** «VR-дайджэст».
**17.00 Серыял «Дрыжыкі».**
**19.05 Серыял «Амерыканцы».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Баявік «Місія невыканальная».**
**22.55 Серыял «Блудлівая Каліфорнія».**

### ВТБ

**6.00, 3.30** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 19.30 Серыял «Кухня».**
**9.30, 13.30, 19.00 Серыял «Аднойчы ў міліцыі».**
**10.00, 20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны 2».**
**11.00 Серыял «Сваццы».**
**12.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**12.30, 23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00, 2.30 Серыял «Метад Лаўровай».**
**15.00, 1.45 Серыял «90210: Новае пакаленне».**
**16.00 Меладрама «Змярканне».**
**18.30, 0.30** «Лаві момант».
**19.00 Серыял «Аднойчы ў міліцыі».**
**19.30 Серыял «Кухня».**
**20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны 2».**
**21.10 Меладрама «У краіне жанчын».**
**1.00 Серыял «Зачараваныя».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.40** Навіны культуры.
**9.20, 0.40** «Наглядальнік».
**10.15 «Падазрэнні містара Уічара. Забойства ў маёнтку Роўд-Хіл». Маст. фільм.**
**11.45** «Лінія жыцця». Шаўкат Абдусаламаў.
**12.40 «Хаджэнне па пакутах». Маст. фільм.**
**14.10** Academia.
**14.55** «Георгій Сямёнаў. Знак вечнасці». Дак. фільм.
**15.40** «Горад №2 (горад Курчатаў)». Дак. фільм.
**16.20** «Сусветныя скарбы культуры».
**16.35** Міжнародны музычны фестываль у Вербʼі. Сольны канцэрт Дзяніса Мацуева.
**17.30** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.10** «Правілы жыцця».
**19.40** «Добрай ночы, малыя!».
**19.50** «Астравы». Аляксей Балабанаў.
**20.30** Да 75-годдзя Уладзіміра Мяньшова. «Маналог у 4-х частках». Частка 1-я.
**21.00** «Тым часам».
**21.45** «Іаган Вольфганг Гётэ». Дак. фільм.
**21.55** «Кінескоп». 71-ы Венецыянскі міжнародны кінафестываль.
**23.00** «Імпрэсіянізм і мода». Дак. фільм.
**23.55** Канцэрт Фестывальнага аркестра Вербʼе. Салісты Рэно і Гацье Капюсоны.
**1.40** Э. Грыг. Сюіта для аркестра з музыкі да драмы Ібсена «Пер Гюнт».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Пад знакам задыяка. Дзева». 1992 год.
**6.30** Дак. фільм «Радасная душа».
**7.10** Дак. фільм «Майкл Джэксан у Маскве».
**7.45** «Гукавая дарожка» ў Лужніках». 1994 год.
**8.35** «Ваш кумір». Мікалай Озераў. 1995 год.
**9.00 Маст. фільм «Мужчыны і ўсе астатнія».**
**10.25** «Дзявятка». 1992 год.
**11.00** «Блакітны агеньчык». 1983 год.
**12.00** Канцэрт гурта «АВІА». 1992 год.
**12.30** «Вакол смеху» «Атэлье гумару». 1983 год.
**14.00 Маст. фільм «Чаканне канцэрта».**
**15.00** «Тэатральныя сустрэчы». 1988 год.
**16.20** «Музычная мазаіка». 1993 год.
**16.35** «Кантрольная для дарослых працягваецца...». 1991 год.
**17.00** «Марафон-15». 1991 год.
**18.30** Тэлеспектакль «Дзеці разладаў». 1986 год.
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Петарс поп-шоу». 1991 год. 1-я частка.
**23.00** Дак. фільм «Надзя Рушава».
**0.00** «Ранішняя пошта» ў Адэсе. 1986 год.
**0.35 Тэлефільм «Следства вядуць ЗнаТаКі».**
**1.35** «Мелодыя надзеі». 1977 год.
**3.00** «Колба часу».
**4.00** «Кінапанарама». «Паралельнае кіно». 1988 год. 2-я частка.

### EUROSPORT

**9.30, 2.15** Аўта- і мотаспорт.
**9.45** Веласпорт. Гран-пры Манрэаль.
**10.45, 16.15, 23.45** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
**12.00** Конны спорт. Вялікі шлем Ролекс.
**13.00, 20.45** Снукер. Мастэрс. Фінал.
**14.45, 1.00** Лёгкая атлетыка.
**17.30** Барацьба. Чэмпіянат свету.
**18.30, 0.30** Футбол. Еўрагалы.
**19.00** Футбол. Фінал. «Бенфіка» (Партугалія) — «Барселона» (Іспанія).
**20.15** All Sports.
**21.45** WATTS.
**22.00** Пра рэслінг.
**23.30** Конны спорт. Скачкі.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 9.00, 13.30, 16.30, 21.00, 2.10** Серыял «Сваты 3».
**5.55** Камедыя «Маленькі прыбытак бацькі».
**7.25** Камедыя «Я буду дома да Раства».
**9.55** Камедыя «Закахацца ў нявесту брата».
**11.30, 19.00, 21.50, 1.50, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**11.45** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**14.30** Камедыя «Філадэльфійская гісторыя».
**17.30** Камедыя «Два ў адным».
**19.20** Камедыя «Сведка на вяселлі».
**22.10** Камедыя «Эмігрант».
**0.15** Камедыя «Шосты элемент».
**3.00** Камедыя «А як жа Боб?».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.15, 18.50, 2.45** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**10.00** «Паненка і кулінар».
**10.30, 4.20** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**12.10, 17.55** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**13.00** «Свая праўда».
**13.55** «Жонка. Гісторыя кахання». Нэлі Кабзон.
**15.15** «Сто пытанняў дарослаіму».
**16.00, 22.40** «Зорныя гісторыі». Дак. серыял.
**16.55** «Шчырая размова».
**20.45** «Усё пачалося ў Харбіне». Серыял. Заключная серыя.
**21.40, 2.00** «Курсанты». Серыял.
**23.30** «Быць чалавекам». Серыял.
**0.30** «Часова даступны». Алена Ваенга.
**1.25** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00** Драма «Мацярык».
**6.40** Меладрама «Блакітная хваля».
**8.35** Камедыя «Піпец».
**10.35** Баявік «Круты і цыпачкі».
**12.20** Меладрама «Добрая дзяўчынка».
**14.00** Камедыя «А вось і Полі!».
**15.40** Трылер «Сачэнне».
**17.20** Трылер «Добры доктар».
**19.00** Камедыя «Давай, да пабачэння!».
**20.40** Камедыя «Замуж на 2 дні».
**22.40** Драма «Калі я памірала».
**0.35** Драма «Асабістае».
**2.35** Баявік «Чалавек-павук 2».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**5.20** Драма «Аляксандр. Неўская бітва».
**7.35** Трагікамедыя «Курачка Раба».
**9.40** Прыгоды «Грэчаскія канікулы».
**11.25** Казка «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».
**13.05** Трагікамедыя «Пяць зорак».
**15.00** Меладрама «У чаканні цуду».
**16.45** Драма «Масква».
**19.20** Трылер «Цёмны свет».
**21.10** Камедыя «Дзень радыё».
**23.00** Трагікамедыя «Не думай пра белых малп».
**1.10** Драма «Адпачынак у верасні».
**3.50** Камедыя «Вусаты нянь».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00, 12.00** Гульні розуму.
**6.30, 12.30** Займальная навука.
**7.00** Зрабі або памры.
**7.30, 19.00** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00, 13.00** Апакаліпсіс. Першая сусветная вайна.
**9.00, 14.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
**10.00** Мегазаводы.
**11.00** Цяжкае золата Аляскі.
**15.00** Цар кракадзілаў.
**16.00** Смяротна небяспечны тузін.
**17.00, 2.00** Вайна генералаў.
**18.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**20.00, 0.00, 3.00** Паветраныя асы вайны.
**21.00, 1.00, 4.00** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**22.00** Космас: Прастора і час.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00** Дамы на дрэвах.
**7.50** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**8.40, 13.15** Як гэта ўстроена?
**9.10, 13.40, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Залатая ліхаманка.
**10.30, 5.10** Што было далей?
**11.25** Каралі аўкцыёнаў.
**12.20, 0.55** Top Gear.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05, 6.05** Махінатары.
**16.00** Пятая перадача.
**16.25, 19.10** Выжыць разам.
**22.00** Выжыванне без купюр.
**23.00** Рачныя монстры.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.
**3.05** Паляўнічыя на рэліквіі — ламбард.



■ Простыя рэчы

# Соль

**У Біблії з пераліку галоўных патрэб для жыцця чалавека вось які ланцужок падаецца: вада, агонь, жалеза, соль, пшанічная мука, мёд, малако, вінаградны сок, алей і вопратка.**

КАЛІ забівалі парсюка і назаўтра накроенае сала дастаткова застывала, бацька гукаў маці і прасіў прынесці соль. Матуля хуценька паварочвалася і праз колькі хвілінак прыносіла з кладоўкі поўна насыпаны гарнец. Гэтая няхітрая дзея паўтаралася з году ў год. Здавалася, соль у нас невыводная, нібыта радовішча якое ў той кладовачцы месціцца. Калі памёр бацька і я наездамі трохі дапамагаў маці па гаспадарцы, дык падчас упарадкавання свежаніны цяпер ужо ў мае рукі перадавала яна соль. Дзе тая соль захоўваецца, у якім кутку, колькі яе, я ніколі не цікавіўся. А потым і наогул нагоды не стала: мама аслабела, катух у хляве, дзе звычайна рохкаў парсючок, каторы год пуставаў. Але аднойчы нечакана зварухнулася стрэмка ў маёй памяці, кальнула — і я папрасіў маці паказаць сваю схованку.

Соль ляжала ў шчыльнай скрынцы, у папяровым мяшку. Узяў, насыпаў на далонь — буйная, як зоркі ў ясную ноч. Таму і не зляжалася за доўгі час у камень.

— З якіх гадоў яна тут? — спытаўся я ў мамы.

— Мусіць, з саракавых, пасляваенных, ці з пачатку пяцідзясятых...

Навучаныя вайной, мае бацькі, як і ўсе аднавяскоўцы, рабілі запас «на новае гора» — а раптам грымне з якога боку, растрэскаецца неба, як яечная шкарлупка...

Узяў я тады пару прыгаршчаў матчынай солі з сабой у горад, знайшоў адмысловы шкляны посуд са шчыльнай, таксама празрыстай накрыўкай, напоўніў яго прывезенай соллю і паставіў на пісьмовы стол, каб закрышталізаваная памяць падсольвала душу...

Жыццё пасолена самім Богам — праз акіян, у якім яно зараджалася. Салёная слязіна гора ды чырвоны цурок крыві змагання — красамоўныя знакі вяртання ў той самы, першаісны акіян вечнасці. Мы вяртаемся ў акіян, а ў зямлю — толькі выпетраныя парэшткі.

Жменька солі, распушчаная ў кіпені, зноў з'яўляецца пасля выпарэння вады — драбок да драбка, колькі й было. Нязводнасцю, неабсяжнасцю запасаў у свеце соль прымерваецца да вечнасці.

Дасведчаныя людзі падлічылі: запас солі на зямлі такі, што ёю можна засыпаць тэрыторыю ЗША слоем вышынёй у дзесяць кіламетраў. Во колькі яшчэ людзей на нашай благаславёнай планеце насоляць сабе гурочкаў, капусткі, воблы ды селядцоў! Калі, вядома, не аддадуць заўчасна Богу душу ў якой-небудзь ліхаманкава развязанай валадарамі свету міжкантынентальнай калатнечы.



Маміна соль.

А даўней жа соль была своеасаблівай прысыпкай ад вайны. Падчас панавання смерці, калі кулі, разлётаюцца, як чмялі, не пахарчуешся малымі, купленымі ў краме на дзень кавалачкамі. Штохвілінна трэба думаць аб якіх-кольвечы запасах харчоў. А як іх, тыя запасы, зробіш без солі?.. Да таго ж нішчымныя ацяробкі ў галадуху ці пусты булён без солі папярок горла становяцца. А пасоленыя — які-ніякі, а наедак.

Соль жа, апроч усяго, яшчэ і незаменная прыправа. Дарэчы, заўгодная нават Богу. Старажытныя яўрэі, калі прыносілі свае ахвяры Усемагутнаму, абавязкова падсольвалі іх... (Не падносіць жа яму які праснак.)

Сярод даўнейшых прыкмет беларусаў ёсць і такія: вялікі ўраджай агуркоў, грыбоў хоць касой касі — да вайны. Вялікі запас бяды не чыніць, але бяда, думалі нашы продкі, чуе яго, гэты запас, як хорт звера. Глядзіш, і загрымела неба жалезным громам... А можа, проста навала за навалай хадзілі па нашай зямлі так часта, што супадала іх чарговае насоўванне з такімі шчодрымі гадамі.

Так або інакш, гартаючы старонкі гісторыі, нас можна назваць народам солі. І не толькі таму, што па краі адна за адной гулялі войны і прывучылі людзей да горка-салёнага жыцця. Асноўным наедкам беларусаў большую частку года здавён былі добра прасоленыя (каб даляжалі да Вялічка, а тады пасівералі пад страхой) кумпякі; кіндзюкі і паляндвіца — каб давіселі на гарышчы да прыпарнай касавіцы, калі іх пакрысе не выпрасяць у маці жарлівыя і ласыя на прысмакі сынкі-падлеткі; костачкі ў кубле, каб з іх зноў і зноў варыць булён ці капусту... Адным словам, соль, соль, соль... А яшчэ ж і тая капуста добра прасолена, каб не ўкісла звыш меры ў дзежцы. Тыя ж агуркі, памідоры, грыбочкі — таксама... І дарма, што цяпер на кухнях вурчаць, як каты, халадзільнікі ды маразільнікі: традыцыю, звычкі, якія ўжо ўеліся ў гены, не задушыць аніякі прагрэс.

Калі я ці жонка згатуем якую страву, дык люблю запытацца ў сваёй 90-гадовай мамы — ці смачна?

— Смачна, — звычайна адказвае яна. — І солька чусцьвіцельна...

От жа, солька — самая першая, звыклая і незаменная прыкмета смаку.

СОЛЬ, каб вы ведалі, рэчыва біблейскае. У Святым пісанні яна згадваецца звыш пяцідзесяці разоў. Прарок Елісей ёю вытоk вады ачышчаў. У той сівой старажытнасці соллю пасыпалі і абціралі нованароджаных дзетак — усё, што пасыпана соллю, не псуецца і не прападае!

У Біблії з пераліку галоўных патрэб для жыцця чалавека вось які ланцужок падаецца: вада, агонь, жалеза, соль, пшанічная мука, мёд, малако, вінаградны сок, алей і вопратка.

Пры зацвярджэнні ўрачыстых дагавораў служкі прыносілі пасудзіну з соллю, і вяршыцелі дзеі бралі ды з'ядалі па колькі драбкоў. Гэта азначала, што саюз будзе цвёрдым, непарушным. (Пры заснаванні СССР, відаць, не пасалілі ў роце.).

Менавіта соль, а не хлеб з царскага стала сімвалізавала ў старажытнасці набліжанасць да каранаванай асобы, саўдзел у дзяржаўных справах. Можа, і нам гасцей трэба сустракаць па-царску — соллю-хлебам, а не наадварот? Прытым прасіць іх не мачаць адламаны кавалачак каравая ў сальнічку, а пасыпаць яго соллю зверху, бо мачаць — дрэнны знак (так рабіў Іуда на Тайнай Вячэры).

Дзеля справядлівасці мушу сказаць, што соль увабрала ў сябе не толькі благаславёнае дабро і лагоду. Яна даволі шкодная пры некаторых захворваннях, а з'ясі звыш меры колькі дзясяткаў грамаў — і бывай, небарака. Гісторыя ведае выпадкі, калі бязлітасныя заваёўнікі густа засявалі палі пераможаных соллю, каб ніводная жытняя іголачка не прабілася на сонца, каб згарэў зародак у насенні.

Соль быццам бы экзаменуе чалавека: наколькі ён разумны, годны і міралюбны.

А яшчэ яна штодня нагадвае хрысціянам аб іх пачэснай ролі — быць «соллю зямлі», ратуючы свет ад маральнага загнівання, як заклікаў сваіх паслядоўнікаў Збавіцель.

...НА досвітку Кацярына Шугулей заходзіла па Ірыну Рублеўскую, а потым ужо ўдзвюх — па Васіліну Гамзюк. Яшчэ шарэла, хмызы і дрэвы былі ахутаны цішынёй. Не думаючы пра дальнюю дарогу, яны ішлі таропка і напачатку моўчкі. Але ўсё адно то тут, то там спуджвалі з галін маўклівых, як яны самі, птушак. Паперадзе ішла Васіліна, якая лепш ведала шлях нацянькі — дзе вузкай дарожкай, дзе сцяжынай праз хмызовы гушчар. Важна было скараціць шлях хоць на якіх сто метраў, бо пры вяртанні дамоў, як ужо ведалі жанчыны ад сваіх таварышак, гэты неадрэзаны лішак будзе доўжыцца, нібы цэлы кіламетр.

У кожнай спадарожніцы ў руцэ была перавязаная матузком, акуратна згорнутая вялізная хустка, а ў ёй — адмыслова пашытыя са шчыльнага кужалю невялічкія мяшэчкі (найлепшы пакунак для солі) ды сёе-тое яшчэ.

Пакрысе святлела наваколле, птушкі ўжо не пужаліся і то з адной, то з другой кроны азываліся, хто дробным пошчакам, хто ручаінным цурчаннем...

У Занавінні, якое доўжылася на добры кіламетр, жанчыны загаворвалі, азіраючы сядзібы, цікуючы за тутэйшымі жыхарамі.

— А ў іх во таксама краму яшчэ не адбудавалі, — казала Васіліна. — Мусіць, як і нам, у Полацак па сольку хадзіць даводзіцца...

У Полацку, да якога добрых шэсцьдзесят кіламетраў (а трэба ж было яшчэ вярнуцца дамоў да густой цемры), жанчыны перакручваліся на адной назе — адразу спяшаліся на чыгуначны склад, хуценька накуплівалі солі — і зноў у дарогу.

...Яны ішлі, як паломніцы, з даволі вялікімі хатулямі за спінамі, якія напачатку здаваліся зусім лёгкімі і не замаруджвалі хады. Жанчыны яшчэ не ведалі показкі, якая нарадзілася з цягам часу ў такіх паходах па полацкую соль. Я і сам не ведаў, пакуль не расказаў яе мне мой сябра Петрачок:

*Выпраўляюцца жанчыны з хатулямі з Полацка, выходзяць за горад, адна й кажа:*

*— Мусіць, не даважыў кладаўшчык солі, падмануў, лайтруга...*

*У Сарочыне, калі пераадолена большая палова дарогі, тая самая кабета зноў пра сваё сумненне, якое стрэмкай засела ў галаве:*

*— А не, відаць, самую меру насыпаў...*

*На аселіцы, калі ўжо відзён дах першай хаты роднай вёскі, спадарожніцы чуюць яе заключную выснову:*

*— А ці не перасыпаў мне той лайтруга солі?.. Далібог, з лішкам прынесла.*

...На паўдарозе Кацярына, Ірына і Васіліна садзіліся трохі падсілкавацца. Здымалі хатулі, даставалі з мяшэчкаў вараныя яйкі і бульбу, пёры цыбулі... Развязвалі і які мяшэчак з соллю, усё адно як з дзіцячай пары ласункам. Няспешна, каб хоць крыху адпачыць, аблуплівалі яечкі і акуратненька, каб долу не ўпаў ніводзін драбок, пасыпалі іх соллю. Адна пасыпала, другая тым часам падстаўляла знізу далоньку...

Жанчыны смакавалі даўно не каштаваную соль і не ўсведамлялі, што, узмужнелыя, яны і самі ўжо сталі соллю сваёй зямлі, узаранай снарадамі і самасейна ўпрыгожанай праскамі.

Дамоў спадарожніцы вярталіся запозна, калі ўжо на чыстым небе ледзь бачнымі драбкамі прабіваліся першыя зоркі.

* * *

...Дапісаў радок — і зноў зірнуў на матчыну соль, якая ў шкляной пасудзіне сашчыльнена ў Галактыку Памяці.

**Сяргей РУБЛЕЎСКІ**


## КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»

**на IV квартал або II паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 9 КАСТРЫЧНІКА 2014 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

7 цепла-вентылятараў Electrolux

Суперпрыз — хлебапеч

Сярод падпісчыкаў 14.10 2014 года будзе разыграна 7 цеплавентылятараў і суперпрыз — хлебапеч. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.10.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2014 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «У цёплую зіму са «Звяздою» чытайце ў нумары газеты «Звязда» за 4.09.2014.

**Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 6.09.14 ПА 31.12.14.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2422 ад 01.09.14, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

### 3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2014 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________ (аддзяленне сувязі)

____________________ на IV кв. або 2-е паўг. 2014 года

Хатні адрас і тэлефон ________ (індэкс) ____________________

Удачы ў розыгрышы!


## Даты Падзеі Людзі

**1790** год — нарадзіўся (горад Слаўгарад) Іван Івановіч Грыгаровіч, беларускі гісторык, археограф, краязнаўца, рэлігійны дзеяч. У 1811-1815 гадах — выкладчык Магілёўскага духоўнага вучылішча, рэктар Гомельскага духоўнага вучылішча, з 1831 года служыў у Пецярбургу. Апісваў рукапісныя кнігі Румянцаўскай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу. Для напісання палітычнай і царкоўнай гісторыі Беларусі збіраў матэрыялы ў архівах Мсціслава і Магілёва. Падтрымліваў навуковыя кантакты з рэлігійнымі дзеячамі і вучонымі Кіева, Вільні, Масквы, Пецярбурга. Рыхтаваў да друку першы беларускі археаграфічны зборнік «Белорусский архив древних грамот». У Пецярбургу выдаў зборнік дакументаў, прысвечаны ўзаемаадносінам расійскіх цароў і рымскіх пап, збор твораў архіепіскапа Г. Каніскага са сваёй прадмовай, удзельнічаў у падрыхтоўцы да выдання «Актаў Заходняй Расіі». Склаў слоўнік беларускай мовы. Памёр у 1852 годзе.

**1934** год — нарадзіўся (горад Мінск) Генадзь Георгіевіч Барташэвіч, беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч, дыпламат. У 1963 годзе скончыў БПІ. Працаваў на Беларускім радыё, на Мінскім станкабудаўнічым заводзе. З 1967 года — сакратар Маладзечанскага, першы сакратар Мінскага гаркамаў КПБ, старшыня Мінскага гарвыканкама. З 1983-га — другі сакратар ЦК КПБ. У 1987-1991 гг. — надзвычайны і паўнамоцны пасол СССР у Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы. З 1993-га — пасол па асаблівых даручэннях Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Памёр у 1993 годзе.

**1941** год — да прычалаў мыса Асінавец з усходняга берага Ладажскага возера падышлі першыя баржы са збожжам, мукой і боепрыпасамі. Пачала дзейнічаць «Дарога жыцця» — адзіная блакадная артэрыя абложанага Ленінграда.



### Было сказана

**Якаў НАВУМЕНКА, народны артыст Беларусі:**

*«Па меры таго, як спазнаю штосьці новае, разумею, наколькі мала мы ведаем пра нашых далёкіх продкаў, як разумна і гарманічна было ўладкавана іх жыццё і як многаму нам, нашчадкам, у іх варта павучыцца».*


ЗАПРАШАЕМ НАВЕДАЦЬ НАШ СТЭНД на выставе «Будпрагрэс» з 09 па 12 верасня!

КЕРАМЗИТ Новолукомль / Novolukoml KERAMZIT

ОАО «ЗАВОД КЕРАМЗИТОВОГО ГРАВИЯ г. НОВОЛУКОМЛЬ»

Официальный партнер конкурса

ISO 9001:2008
ISO: 14001:2004
OHSAS 18001:2007

Керамзит – тепло- и звукоизоляционный материал насыпью и фасованный по 0,8 м³ и 0,05 м³
Коэффициент теплопроводности 0,0912 – 0,1099 Вт/м·°С

Керамзитобетонные блоки «ТермоКомфорт» – стеновой материал XXI века
• Сопротивление теплопередаче фрагментов стен, м²·°С/Вт: 3,38; 3,7; 4,26
• Индекс изоляции воздушного шума, дб: 51; 53; 55

РБ, 211162, Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, Крупскоешоссе, 1



Продукция сертифицирована, имеет CE-маркировку

Наша продукция комфортна, экологична и долговечна!

Тел./факс: (+375 2133) 5-60-31, 5-66-11, 5-53-08, 5-73-47
www.keramzit.by e-mail: info@keramzit.by


■ Тэлесеткі

## Як чуецца, так і пішацца?

**«Беларусь 3» прапануе гаварыць на роднай мове без памылак**

13 верасня на тэлеканале адбудзецца прэм'ера віктарыны «Размаўляем па-беларуску». Яе ўдзельнікі — людзі, якія далёка не бліскуча ведаюць беларускую мову, але вельмі цікавяцца і хочуць на ёй размаўляць.

Дапамагчы ў гэтым — разабрацца ў значэнні і паходжанні розных слоў, крылатых фраз і ўстойлівых выразаў — узяліся гомельскія тэлевізійнікі сумесна з экспертамі-моваведамі.

Праверце сябе і вы — хаця б седзячы ля экранаў. А калі вырашыце стаць удзельнікам, заходзьце на сайт тэлерадыёкампаніі «Гомель» http://tvrgomel.by/ або сайт канала «Беларусь 3» http://3belarus.by/ і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запаўняйце заяўку на ўдзел каманды. Гульцам забяспечаны добрыя эмоцыі і цікавыя адкрыцці, а пераможцам — прыемныя і карысныя прызы!

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

**НАРОДЖАНЫЯ 12 верасня**

**Этычныя пытанні, пытанні гонару і справядлівасці вельмі важныя для іх. Гэта сціплыя, спакойныя людзі, якія любяць адзіноту. Адкрытыя і працавітыя асобы, яны любяць, каб іх справы ўсё казалі за іх. Пры неабходнасці яны рашуча супрацьстаяць усемагчымым праблемам і цяжкасцям, перакананы ў тым, што праўда нарэшце атрымае перамогу. Нягледзячы на велізарныя ідэі і праекты, народжаныя 12 верасня прагматычныя і рэалістычныя асобы, якія не паважаюць неабгрунтаваны аптымізм. Ключ да іх поспеху знаходзіцца ў іх магчымасці ўраўнаважыць разумовы і фізічны бок сваёй асобы, у здольнасці перыядычна адыходзіць ад празмерна актыўнага жыцця ў цішу, цалкам пазбягаючы розных спраў.**


Былую танцорку, цяперашнюю пявунню, завішную гаспадыню, нястомную працаўніцу, выдатную маці і бабулю, найлепшую родзічку, жанчыну шчодрай душы — **Валянціну Міхайлаўну ГАРДЗЕЙЧЫК** сардэчна **віншуем з днём нараджэння** і жадаем на радасць усім нам 100 гадоў пражыць, кожны дзень сустракаць з аптымізмам, дзякаваць Богу за шчаслівыя дні!

**Усе родзічы з Гомеля.**


## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.37 | 19.34 | 12.57 |
| Віцебск — | 6.25 | 19.25 | 13.00 |
| Магілёў — | 6.27 | 19.24 | 12.57 |
| Гомель — | 6.25 | 19.19 | 12.54 |
| Гродна — | 6.52 | 19.49 | 12.57 |
| Брэст — | 6.54 | 19.48 | 12.54 |

**Месяц**

***Поўня 9 верасня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

***Пр.** Лізаветы, Аляксандра, Арсенія, Данілы, Івана, Паўла, Пятра.*
***К.** Марыі, Кіра, Пятра*



Фота Тараса ШЧЫРАГА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +22..+24°С | КІЕЎ +24..+26°С | РЫГА +17..+19°С |
| ВІЛЬНЮС +21..+23°С | МАСКВА +21..+23°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +15..+17°С |

## УСМІХНЕМСЯ

— Колькі табе трэба, каб навучыцца вадзіць?
— Прыкладна, 7—8.
— Чаго, месяцаў?
— Не, аўтамабіляў.

**Паляванне — гэта спорт! Асабліва калі патроны скончыліся, а дзік яшчэ жывы.**

Люблю сваю бабулю! Для яе я заўсёды худая.

**«Два прыяцелі:**
**— Уяўляеш, мая жонка зусім ужо здурнела — назаўжды адмовілася займацца са мной сексам!**
**— У якім сэнсе?**
**— Ну, сказала, што пакуль цвярозы дадому не прыйду — сексу не будзе!.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.330. Індэкс 63850. Зак. № 3749.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 верасня 2014 года.